ФОРМУЛА БЭНКСІ

Калі карціна «пацягне» на мільярд долараў?

Карціна «Дзяўчынка з шарам» брытанскага мастака Бэнксі пасля самазнішчэння на аўкцыёне набыла статус арт-аб'екта і атрымала новую назву, паведаміў тэлеканал CNN са спасылкай на заяву аўкцыённага дома Sotheby's. Цяпер твор называецца «Каханне ў сметніцы». Работа атрымала ідэнтыфікацыйны сертыфікат Бэнксі, у далейшым яна будзе выстаўляцца ў кошыку для смецця. Уладальнікам твора стала тая самая пакупніца, якая набыла «Дзяўчынку з шарам» па выніках таргоў за 1,4 мільёна долараў, паведаміў аўкцыённы дом. Сузаснавальнік арганізацыі of MyArtBroker арт-дылер Джоўі Сіер назваў куплю мудрым рашэннем. «У разрэзаным стане карціна Бэнксі стала часткай гісторыі. Па нашых падліках, яе цана вырасла мінімум на 50 працэнтаў і дасягнула двух мільёнаў фунтаў», — пракаментаваў эксперт. Такім чынам, дзякуючы крэатыўнаму ходу, літаральна за некалькі дзён твор мастацтва значна дадаў у кошце. Як арт-рынак становіцца заўважнай часткай глабальнага інвестыцыйнага працэсу?

ПРАВІЛА ТРОХ D

Расстаноўка сіл і ўзаемасувязі гульцоў арт-рынку моцна змяніліся за апошні час. Ландшафт ствараюць перш за ўсё прафесійныя гульцы: музеі, аўкцыённыя дамы, галерэі, прыватныя дылеры. Пры гэтым у апошнія два-тры дзесяцігоддзі сітуацыя кардынальна змянілася. Да 1980-х абсалютнай дамінантай індустрыі былі галерэі і дылеры, а аўкцыёны выглядалі гэткімі «падчаркамі». Яны некалькі стагоддзяў змагаліся за месца пад сонцам. Традыцыйна ў пагоні за першакласным таварам аўкцыённыя дамы шмат у чым абапіраюцца на формулу трох D — death, divorce, debt (смерць, развод, даўгі) — і таму самым уважлівым чынам сочаць за некралогамі і свецкай хронікай. Адпаведна гэтая справа доўгі час лічылася заняткам, у якім элегантнага, мякка кажучы, зусім няшмат. Іншая справа з галерэйным бізнесам. Галерэі пайшлі ад палацавых «кабінетаў», напоўненых творамі мастацтва, і атрымалі ў спадчыну іх высакародны імідж.

Аўкцыёны здабылі вагу спярша дзякуючы патанненню друку (аб'явы, а пазней каталогі — аб падзеі даведваецца больш людзей), затым — вынаходніцтву тэлефона (удзельнічаць у таргах стала магчыма канфідэнцыяльна і здалёк). Сур'ёзны прарыў адбыўся ў 1970-х — аўкцыённы дом Christie's (а пазней і Sotheby's) адкрывае публічны доступ да вынікаў таргоў. Гэта змяніла ўсё — даныя аб продажах ляглі ў аснову новай сістэмы арт-рынку. «Кошт малатка» стаў свайго роду пунктам адліку: наколькі б уплывовымі ні былі дылер або галерэя, вынікі таргоў не падрабіць, і менавіта яны цяпер вызначаюць цэнаўтварэнне. Арт-рынак, гістарычна вельмі закрыты, інтравертны, набыў глабальную празрыстасць.

З МАЛАТКА

Аб'ёмы продажаў аўкцыёнаў і галерэй на сусветным арт-рынку супастаўныя (у прыватнікаў толькі невялікая перавага), але лічбы не адказваюць на пытанне наконт таго, хто вызначае правілы гульні. А тут галоўныя аўкцыёны. Што датычыцца выраўноўвання доляў рынку, то аўкцыённаму сегменту дапамог тэхнічны прагрэс — з'яўленне ў 2000-х анлайн-трансляцый дазволіла падключацца да таргоў з любога пункта свету. Гэта ўжо іншы маштаб і чарговая рэвалюцыя: застаючыся кансерватыўнымі па сутнасці, аўкцыённыя дамы сталі абсалютнымі аўтарытэтамі і лідарамі рынку. Цяпер яны «заказваюць музыку», і паміж імі і астатнімі гульцамі складваецца даволі цікавае ўзаемадзеянне. Вялікія таргі вызначаюць жыццёвы рытм усёй супольнасці: не толькі галерэі, але і музеі да гэтага моманту рыхтуюць выстаўкі і праекты ў разліку на прыток аўдыторыі за кошт калекцыянераў і іх «сатэлітаў». У галерэй, зрэшты, ёсць свой козыр — арт-кірмашы. У год іх па ўсім свеце праходзіць каля паўсотні. У адказ аўкцыёны пашыраюць геаграфію і падчас кірмашоў часта праводзяць тэматычныя таргі ў тым жа горадзе.

Праславутая канкурэнцыя галерэй і аўкцыёнаў, некалі сапраўды вельмі вострая, — гісторыя насамрэч неадназначная. Галерысты і дылеры ўважліва сочаць за таргамі і нярэдка самі становяцца іх удзельнікамі: на аўкцыёнах, асабліва невялікіх, правінцыйных, часта выстаўляюцца ўнікальныя прадметы, якія можна купіць па вельмі выгаднай цане, а потым перапрадаць у сябе ў галерэі. Такіх схаваных працэсаў на рынку мастацтва і калекцыянавання даволі шмат. Цікавая тэндэнцыя апошняга часу — гэткая дыфузія аўкцыённа-галерэйных формаў дзейнасці. Галерэі ў спробе ўмацаваць свае пазіцыі пачынаюць праводзіць уласныя аўкцыёны, чаго раней ніколі не было.

Аўкцыённыя дамы, у сваю чаргу, адкрываюць галерэйныя прасторы (узяць той жа Sotheby's з яго S2 або кітайскі Poly Auction і яго Poly Gallery Hong Kong). Так зручней шукаць новых сучасных мастакоў і выводзіць іх на рынак. Фармат прыватных продажаў, першапачаткова абсалютна галерэйны, аўкцыённыя дамы таксама інтэнсіўна асвойваюць. Словам, і тыя, і іншыя пераадолелі псіхалагічны бар'ер, паступова адмаўляючыся ад ідэйных адрозненняў. Перамены адназначна ідуць на карысць новаму сінтэтычнаму рынку.

КОД ДА ВІНЧЫ

Як паведаміў партал ArtPrice, адзін з найбуйнейшых у свеце, які займаецца зборам аўкцыённых цэн і іх аналізам, летась індэкс Artprice Global Price Index (зрэшты, як і ў 2015 і 2016 гадах) вагаўся каля значэння ў 150 пунктаў, а гэта азначае, што 100 долараў, укладзеныя ўсярэднены твор мастацтва ў студзені 1998 года, прынеслі б пры перапродажы 150 долараў (на піках у 2008-м і 2012-м індэкс складаў каля 220). Тым не менш, на думку экспертаў партала, вынікі мінулага года адзначылі ўступленне арт-рынку ў новую фазу. Паводле справаздачы агенцтва Artprice, летась ён нарэшце пачаў расці. Пасля двух гадоў падзенняў (мінус 10 працэнтаў у 2015-м і мінус 23 працэнты ў 2016-м) рост продажаў выглядае ўражальна. Прычым рэабілітацыя здарылася адразу на некалькіх «франтах» — еўрапейскім, амерыканскім і азіяцкім. Калі першая палова мінулага года дэманстравала млявы рост, то другая — актыўнае ажыўленне продажаў. У прыватнасці, Кітай — плюс 20 працэнтаў, ЗША — плюс 53, Вялікабрытанія — дадатковыя 26 працэнтаў, Францыя і Германія — плюс 48 і 18 працэнтаў адпаведна. Летась абарот арт-рынку склаў 63,7 мільярда долараў. Гэта толькі калі мець на ўвазе легальны бок. Аб'ёмы «шэрага» рынку ўнушальныя. Па звестках Newsweek, гандаль крадзенымі творамі і падробкамі ў апошнія сорак гадоў стаў трэцім па даходнасці крымінальным бізнесам, саступаючы толькі наркотыкам і зброі.

Сусветныя аўкцыённыя дамы не маглі нарадавацца попыту на розныя кірункі — ад галандскіх класічных пейзажаў да сучаснага абстракцыянізму і прадавалі творы на сотні мільёнаў долараў. У выніку аб'ёмы сусветнага рынку прадметаў мастацтва летась вырасліна 12 працэнтаў, паведамляецца ў сумесным даследаванні банка UBS і выстаўкі Art Basel. Два полюсы рынку — Кітай і ЗША — аказаліся ў раўнавазе, з аўкцыённым абаротам па $5 млрд. У снежні мінулага года кошт работы кітайскага мастака ўпершыню перавысіў $100 млн: цыкл з 12 пейзажаў Ці Байшы сышоў на таргах пекінскага Poly Auction за $140 млн (ранейшы рэкорд у $66 млн належаў таму ж майстру).

Карціна Леанарда да Вінчы Salvator Mundi («Збаўца свету», каля 1500 года) прададзена на нью-ёркскіх таргах пасляваенным і сучасным мастацтвам Christie's за неверагодную суму 450 млн долараў. Гэта самая вялікая сума, з калі-небудзь заплачаных за карціну як на адкрытых аўкцыёнах, так і на прыватных продажах. Таргі за Леанарда, якія доўжыліся каля 20 хвілін, неаднаразова перарываліся апладысментамі і смехам у зале — здавалася, што ўдзельнікі аўкцыёну не вераць у рэальнасць таго, што адбываецца. Уладальнікам палатна стаў наследны саудаўскі прынц Мухамед бен Сальман Аль Сауд, які вырашыў выставіць «Збавіцеля» ў галерэі Луўр Абу-Дабі. Гэты музей, які атрымаў права выкарыстоўваць брэнд Луўра, адкрыўся ў сталіцы Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў.

Капіталы манархій Персідскага заліва інвестуюцца цяпер у мастацтва. Як адзначыў французскі штотыднёвы часопіс Marianne, гэта спрэчка за культурны ўплыў, у якім дзяржавы і шматнацыянальныя карпарацыі сутыкаюцца на сусветным узроўні. Штогод ва ўсім свеце адкрываецца прыкладна па 700 новых музеяў, кожны з якіх, як сказаў адзін амерыканскі арт-дылер, імкнецца чаго б гэта ні каштавала набыць сваю «Мону Лізу», каб хоць неяк апраўдаць уласнае існаванне.

«Нашу прафесію змяняе інтэрнэт, — лічыць спецыяліст па старым жывапісе Марк Эндэвельд. — Мы прысутнічаем пры сапраўднай глабалізацыі рынку мастацтва». Прафесіяналы сектара прывыклі да масавага прыходу новых пакупнікоў з краін Заліва. Да 2030 года Саудаўская Аравія плануе інвеставаць $2 млрд у мастацтва і культуру. Луўр Абу-Дабі мае намер штогод выдзяляць на набыццё твораў мастацтва €40 млн.

СТАЎКІ РАСТУЦЬ

Сусветным лідарам сярод аўкцыённых дамоў з'яўляецца Christie's, які нагандляваў на $4,4 млрд. Sotheby's на другой пазіцыі з агульнай сумай 3,4 мільярда долараў. Далей ідуць кітайцы: Poly Auction — $1 млрд і China Guardian — $815 млн. На пятым месцы Phillips — $471 млн. У індывідуальным рэйтынгу Топ-500 самых прададаных мастакоў сусветных аўкцыёнаў — 231 еўрапеец, 162 азіяты і 82 паўночнаамерыканскія аўтары. А вось у Топ-10 не так — чатыры кітайцы, тры еўрапейцы і тры амерыканцы. І наогул у 2000 годзе ў рэйтынгу Топ-500 быў усяго адзін кітаец (Чжан Дацянь), а ў 2017-м іх ужо 18 чалавек.

Тэндэнцыя росту працягваецца і сёлета. Таму сусветныя эксперты прадказваюць пачатак эпохі адраджэння паспяховых продажаў мастацтва ўжо ў найбліжэйшай перспектыве. Паводле меркавання экспертаў партала ArtPrice, за два апошнія дзесяцігоддзі рынак мастацтва змяніўся прынцыповым чынам. Аўкцыённы абарот вырас з $2,7 млрд да $14,9 млрд, кошт самога дарагога твора мастацтва — з $71,5 млн да $450,3 млн. За апошняе дзесяцігоддзе рынак мастацтва вырас на 212 працэнтаў, пацвердзіўшы сваю рэпутацыю ў якасці аднаго з найбольш прывабных кірункаў укладання інвестыцый.

Пры гэтым колькасць мастакоў, прадстаўленых на сусветных таргах, павялічылася крыху больш чым у два разы, як і колькасць прададзеных лотаў. А колькасць аўкцыённых дамоў і аўкцыёнаў вырасла не больш чым на трэць. Усе гэтыя лічбы сведчаць аб тым, што даражэе кожны канкрэтны твор. І будзе даражэць надалей — у агляднай перспектыве, па прадказаннях экспертаў ArtPrice, цана на асобны твор мастацтва можа дасягнуць аднаго мільярда долараў! Таму формула, адпрацаваная падчас продажу карціны Бэнксі (вядома, з іншымі спосабамі рэалізацыі), спатрэбіцца і ў далейшым. Стаўкі растуць.

Захар БУРАК.